№ 38 (3881)

20 мая 2014 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

ГАЗЕТА—ЧЫТАЧЫ

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Вас чакаюць...

Каб не застацца без «Народнай Волі»

Так, Вас, шаноўныя сябры, чакаюць штодзень на пошце і ў спецыялізаваных падпісных пунктах "Белсаюздруку". Ідзе падпіска на другое паўгоддзе — не застаньцеся без "Народнай Волі".

Каму неабходна прадоўжыць падпіску на чэрвень — зрабіце гэта, калі ласка, да 28 мая.

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

АКТУАЛИИ

Светлана КАЛИНКИНА

Продаются дети!

Бородатая Кончита, победитель "Евровидения", взорвала мозг нашего обывателя. *"Кошмар и ужас! Куда катится мир?! И ведь все это видят дети!"* Бдительные хранители традиционных моральных устоев возмущены, обличают, пишут письма протеста, требуют запретить...

Конечно, несколько странная реакция для страны, которая и большую любовь, и разбитое сердце много лет "запевала" Веркой Сердючкой и не видела в этом ничего ненормального или аморального. А вот на Кончите нашего высокоморального человека заклинило. Что ж, бывает...

Однако шоу-бизнес это всего лишь зрелище. Его задача развлекать, эпатировать, шокировать, доводить до абсурда существующую реальность. Гораздо страшнее, когда не шокирует дикость в реальной жизни. Когда государство растит чудовищ, при этом делая вид, что ничего вопиющего не происходит.

Беларусь продает детей.

Это не секрет, это все знают, это услуга. На нее есть официальные прейскуранты и ценники, под нее написаны законы, подготовлены кадры, созданы фирмы и инфраструктура обслуживания.

Это ведь перспективный бизнес — продать ребеночка. Тем более, что у нас тракторы-телевизоры не самого лучшего качества получаются, зато детки — высший сорт.

Продаем! Дорого!

Сейчас выстрелило громкое уголовное дело, обвинение по которому не укладывается в голове — продажа детей. Белорусская фирма "усовершенствовала" разрешенный государством бизнес по вынашиванию детей в живых инкубаторах и попалась.

Проще говоря, пару лет назад с разрешения государства появились у нас уважаемые высокооплачиваемые труженицы, которые работают живыми инкубаторами — вынашивают в своих животах детей обеспеченным парам. Почему пишу "уважаемые"? Потому что государство их не обижает, в оплате больничных листов и иных положенных выплат они приравнены ко всем остальным будущим мамам, которые будут ночами не спать, ловить каждый вздох и каждое "агу" своего ребеночка. Эти не будут. Эти родят детку, продадут и на вырученнные деньги сделают ремонт в квартире. Или купят машину. Или шубу из шиншиллы, чтобы все обзавидовались.

Но этих женщин не считают моральными уродами, их не клеймят в СМИ, их вид заработка в нашей стране не считается позорным, им даже социальные выплаты от государства положены.

Впрочем, как не считается аморальной и новая отрасль медицинского туризма в Беларусь — за ребеночком.

Уголовное дело сейчас заведено по одной простой причине: суррогатные мамы вынашивали и продавали не чужих, а своих собственных детей. Грубо говоря, не в пробирочке от богатых мамы-папы были зачаты эти детки, их суррогатные мамы — это биологические мамы и есть. То есть вышел обман клиентов. По неофициальной информации, в деле минимум 14 эпизодов.

14 живых, розовощеких, чудесных малышей были проданы своими мамашами с подачи высококлассных специалистов-медиков!

Хотя если задуматься: такая ли большая разница, из чьих конкретно яйцеклетки и сперматозоида вырос маленький человек, если женщина, которая его выносила, с которой он был связан пуповиной, которую он по утрам приветствовал, поглаживая изнутри по животу своим маленьким кулачком и которой кричал свое первое "Уа!" в этом мире, рожает этого человечка только с одной целью — продать.

Более того, в стране создаются все мыслимые и немыслимые условия, чтобы как можно больше здоровых молодых белорусок могли зарабатывать на жизнь таким способом.

Бородатая Кончита из Австрии возмутила нашего обывателя? Да пусть хоть стоя на голове поют, с бородой, растущей из пятки. Не нравится — не смотри, вот и вся проблема.

Зато в Австрии нет бизнеса по продаже детей. Шоу-бизнес — на любой вкус, а вот живых деток не купишь.

И в Германии суррогатное материнство запрещено, и во Франции, и в Италии... Для исламского мира такое просто немыслимо — страшнейшее преступление, казнят. В супердемократичных США суррогатное материнство разрешено всего в нескольких штатах, причем со многими оговорками. В частности, когда суррогатной мамой может стать только близкая родственница. Например, одна сестра может выносить ребенка другой сестре.

А вот Беларуси своих детей продавать не жалко, тут у нас моральных ограничений нет. Более того, например, в России суррогатной маме оставляют шанс быть человеком. Там женщина может родить ребенка и не отдать его, оставить себе, не переступить ту черту, которая разделяет людей и нелюдей. Зато в Беларуси законодательство "усовершенствовали", у нас остаться человеком не получится — ребенка отберут, даже если суррогатная мама одумается и будет на коленях умолять добрых докторов не забирать его.

И при этом мы считаем себя высокоморальной нацией, воспитанной на христианских ценностях, с очень консервативным общественным мнением. Наш возмущенный обыватель искренне бунтует против какой-то Кончиты. Но в то же время абсолютно спокойно взирает на то, что государство сделало легальным, обычным, нормальным делом бизнес по продаже детей.

Всем молодым и здоровым белорускам фирмы гарантируют в течение месяца обеспечить высокооплачиваемую "должность" живого инкубатора. И никакой иной высокооплачиваемой работы в нашем государстве никто никому не гарантирует. Это ли не есть настоящая дикость?..

ПАДЛІЧЫЛІ

Адкуль жа ўзяцца грашам?

Прадпрыемствы і арганізацыі Беларусі ў студзені—сакавіку 2014 года атрымалі чысты прыбытак у памеры каля 9 трыльёнаў беларускіх рублёў, і гэта на 27 працэнтаў меней, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

А калі ўспомніць, як за год змяніўся курс долара, то адразу робіцца зразумелым, чаму мы адчуваем сябе ўсё бяднейшымі.

Дарэчы, па стане на 1 красавіка 2014 года ў Беларусі налічвалася амаль 1,5 тысячы прадпрыемстваў, якія ўвогуле ніякага прыбытку не мелі — адны толькі страты. Прычым чысты аб'ём стратнасці ў грашовым вымярэнні ў параўнанні з першым кварталам мінулага года вырас удвая.

ФОТАФАКТ

Дарога правалілася прама пад машынай

Надзвычайнае здарэнне адбылося ўчора ў Ельскім раёне Гомельскай вобласці. Моцныя ападкі, якія абрынуліся на рэгіён у выхадныя дні, паднялі ўзровень у мясцовым вадаёме. У выніку падмыву дарожнага палатна на аўтадарозе вёска Княжабор'е — вёска Бабруйка над шлюзам адбыўся правал дарогі памерамі 10 на 12 метраў. Прычым усё здарылася якраз у той момант, калі па дарозе ехалі работнікі аварыйнай брыгады Ельскага раёна электрасетак. Уазік з работнікамі праваліўся ў меліярацыйны канал. Пацярпелых, на шчасце, няма.

КАЛІ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР

Крэмль: Расія адводзіць войскі ад мяжы з Украінай?

Прэзідэнт Расіі **Уладзімір Пуцін** даў каманду міністру абароны **Сяргею Шайгу** вярнуць войскі, якія праходзілі вучэнні ў памежных з Украінай Бранскай, Растоўскай і Белгародскай абласцях, у месцы пастаяннай дыслакацыі.

Акрамя таго, Масква вітала першыя кантакты паміж Кіевам і прыхільнікамі федэралізацыі.

ДАРЭЧЫ

Украінскія следчыя працягваюць расследаванне прычын адэскай трагедыі, падчас якой загінулі каля 40 чалавек.

Учора стала вядома, што сапраўды прычынай гібелі людзей мог быць не пажар. На месцы здарэння быў знойдзены хлараформ. Пра гэта паведаміў на брыфінгу намеснік начальніка ГСУ МУС Украіны **Віталь Сак.** Гэта рэчыва выклікае спыненне дыхання.

Намеснік міністра паведаміў, што МУС Украіны звярнуўся па дапамогу да спецыялістаў Ізраіля для больш падрабязнай экспертызы.

Ён паехаў ваяваць...

Служба бяспекі Украіны папярэдзіла тэракт на Куліковым полі ў Адэсе. Тэрарысты, сярод якіх аказаўся і грамадзянін Беларусі, хацелі падарваць аўтамабіль у натоўпе людзей.

Зараз затрыманы тры супрацоўнікі прыватнай ахоўнай структуры, якія вялі схаванае візуальнае назіранне за Куліковым полем, і грамадзянін Рэспублікі Беларусь — нехта А.Шабалін. Паведамляецца, што ён з'яўляецца актывістам радыкальнай прарасійскай структуры. Падчас допыту беларус таксама прызнаўся ва ўдзеле ў масавых беспарадках 2 мая ў Адэсе.

"Устаноўлена, што Шабалін меў намер за адпаведнае фінансавае ўзнагароджанне, атрыманае ад лідараў прарасійскіх сіл, стварыць групу наймітаў для ажыццяўлення правакацый у Луганскай вобласці з мэтай зрыву выбарчага працэсу. Затрыманы праз пасярэднікаў устанавіў кантакт і падтрымліваў сувязь з сепаратыстамі не толькі для выезду ў Луганск, але і для забеспячэння ўмоў знаходжання іх прадстаўнікоў у Адэсе для дэстабілізацыі сітуацыі ў рэгіёне", — гаворыцца ў паведамленні СБУ.

І гэта не адзіны беларус, які апынуўся ў зоне канфлікту. Нашы землякі, што паехалі на дапамогу сепаратыстам, нават выкладвалі свае фотаздымкі са зброяй у сацыяльных сетках.

УЧОРА

Зноў карупцыянеры?

Учора стала вядома пра затрыманне двух намеснікаў старшыні Гомельскага аблвыканкама. Яны падазраюцца ў карупцыі і злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі, паведамілі ў Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь.

Крымінальная справа аб карупцыі службовых асоб Гомельскага аблвыканкама распачата па ч.3 арт.424 КК РБ. Санкцыі па гэтым артыкуле — пазбаўленне волі на тэрмін ад 3 да 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

Спачатку прозвішчы затрыманых не называліся. Аднак увечары Следчы камітэт паведаміў, што былі затрыманы **Віктар Банчук,** першы намеснік старшыні аблвыканкама, куратар па пытаннях сельскай гаспадаркі і галін, звязаных з ёй, і **Віктар Трызно,** намеснік старшыні па сацыяльнай сферы.

Іншыя падрабязнасці расследавання крымінальнай справы пакуль не выдаюцца.

Назапасілі...

Нацстат сведчыць: складскія запасы беларускіх прадпрыемстваў у красавіку павялічыліся на 1,4 трлн рублёў і па стане на 1 мая дасягнулі 83,5% ад месячнага аб'ёму прамысловай вытворчасці. Агульны аб'ём складскіх запасаў на пачатак мая ў грашовым выражэнні склаў 35,2 трлн рублёў (супраць 33,8 трлн рублёў — на 1 красавіка).

Самы вялікі ўнёсак у прырост складскіх запасаў у красавіку зроблены прадпрыемствамі, падведамаснымі Міністэрству прамысловасці, Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання і дзяржканцэрну "Беллегпрам".

Мінус 200 мільёнаў долараў

У першым квартале 2014 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2013-га тавараабарот Беларусі з Украінай знізіўся амаль на 200 млн долараў, ці на 13,7%, сведчаць звесткі афіцыйнай статыстыкі.

Украіна з'яўляецца другім па велічыні (пасля Расіі) гандлёвым партнёрам Беларусі. За першы квартал гэтага года тавараабарот паміж Беларуссю і Украінай склаў 1,25 млрд долараў.

ПАД ГРАДУСАМ!

Лета прыйшло

Цёплае з дажджамі надвор'е будзе пераважаць у Беларусі на бягучым тыдні, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра ***Дзмітрый Рабаў.***

У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы, месцамі прагназуюцца ліўні, днём у асобных раёнах магчымы град. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 12—19 градусаў, днём будзе ад 24 да 29 градусаў.

У сераду ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымы навальніцы, днём — град. Тэмпература паветра ноччу складзе 10—17 градусаў, днём — ад 20 да 27 градусаў цяпла.

У другой палавіне тыдня з ростам атмасфернага ціску дажджоў і навальніц стане менш. У чацвер дажджы пройдуць месцамі, магчымы навальніцы. У начныя гадзіны тэмпература паветра складзе плюс 10—17 градусаў, днём прагназуецца ад 21 да 28 градусаў.

ОПРОС

Продолжаем знакомить с результатами опроса общественного мнения, проведенного недавно независимыми социологами НИСЭПИ (зарегистрирован в Вильнюсе). Опрошено 1502 респондента 18 лет и старше, предельная ошибка репрезентативности не превышает 0,03.

За невысокую зарплату на гарантированной работе!

И на 23-м году независимости белорусское общество все никак не может определить свое отношение к двум главным "*измам*" советской идеологии — к капитализму и социализму. На вопрос "Какой строй более приемлем для Беларуси?" ответы респондентов разделились практически поровну: капитализм — 38,3%, социализм — 39,9% (еще 21,8% затруднились ответить).

Две ведущие общественно-политические формации XX века, согласно стандартному курсу марксизма-ленинизма, отличались между собой в первую очередь господствующим типом собственности. Поэтому нет ничего удивительного в том, что в вопросе сравнительной эффективности государственной и частной собственности в белорусском обществе также нет согласия (табл.1).

Таблица 1. Динамика распределения ответов на вопрос "Какая форма собственности, на ваш взгляд, экономически более эффективна?", %

Вариант ответа	12'93	11'94	06'95	06'96	06'97*	03'14
Государственная	29.0	39.7	47.1	44.8	48.3	37.7
Частная	52.8	45.9	41.8	42.5	44.0	51.3
Разумное сочетание обеих	11.7	8.6	8.5	10.0	—	—
Коллективная	1.0	0.5	0.2	1.0	—	—
Другая	0.9	2.9	0.7	0.2	5.7	2.8
НО	4.6	2.4	1.7	1.5	2.0	8.2

** В связи с изменением списка предлагаемых вариантов ответов сравнивать результаты 1993—1996 гг. с результатами 1997—2014 гг. не совсем корректно.*

В декабре 1993 г., когда еще не наступило разочарование от ожиданий перестройки, преимущество частной собственности для большинства белорусов было очевидно. Но уже через два года в лидеры "вырвалась" государственная собственность. Следует отметить, что якобы склонные к коллективизму белорусы ни в одном из опросов 1993—1996 гг. не отметили эффективность коллективной собственности.

Личный опыт, приобретенный белорусами за 23 года строительства белорусской экономической модели, повысил "рейтинг эффективности" частной собственности. В марте он составил 51,3%, но и доля сторонников государственной собственности все еще остается запредельно высокой по европейским меркам.

(Окончание на 2-й стр.)

БЕЛАРУСЬ—УКРАІНА

Лазавік будзе назіраць за выбарамі ўкраінскага прэзідэнта

Цэнтрвыбаркам Беларусі атрымаў запрашэнне прыняць удзел у назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ва Украіне, паведаміў сакратар ЦВК **Мікалай Лазавік.**

Прынята рашэнне, што з беларускага боку назіраць за пазачарговымі выбарамі прэзідэнта будуць Мікалай Лазавік і намеснік старшыні ЦВК — дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў **Вадзім Іпатаў.**

"Мы рыхтуемся да гэтай паездкі, — пракаментаваў сітуацыю Мікалай Лазавік. — *Зараз усё залежыць ад таго, ці не зменіцца абстаноўка ва Украіне. Мы гатовы пазнаёміцца з практыкай падрыхтоўкі і правядзення выбараў у гэткіх складаных сацыяльна-палітычных умовах у гэтай краіне. Цэнтральная камісія ва Украіне працуе вельмі напружана, умовы працы складаныя. Тым не менш выбары рыхтуюцца, і хацелася б, каб іх правядзенне неяк знізіла градус палітычнага напалу".*

Плануецца, што беларускія назіральнікі вылецяць ва Украіну 23 мая.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20 МАЯ 2014 г.

КОМАНДИРОВКА ПО ПИСЬМУ

Ловушка

С 2011 года Светлана Тимофеевна Данченко живет в аду. Примерно таково самоощущение женщины. В ее частный дом без ее согласия прописали чужого человека. Брата мужа сестры — вот такая цепочка отношений. Десятая вода на киселе, если по-народному. Сообщение из нотариальной конторы упало на Светлану Тимофеевну дьявольским распятием. Оно буквально придавило человека к земле, заставив ощутить свою безмерную ничтожность перед судьбой. И хотя прописанный не живет у нее под крышей и, по всей видимости, не собирается, сам факт того, что на родимый дом претендует кто-то, ей почти не знакомый, поселило в душе старой женщины чувство глобальной катастрофы.

Но как С.А.Дешковичу, проживающему в Витебске, досталась 1/3 дома С.Т.Данченко, проживающей в Орше, и право на прописку в чужом жилище, спросите вы? Вопрос интересный. И официальный ответ на него есть: по наследству.

Ответ этот устраивает суд и нотариальную контору. Но для Светланы Тимофеевны он есть вопиющая несправедливость, петля на шее, трагический поворот жизни, к слову, и до сей поры очень непростой. Она инвалид 2-й группы, одинокая, немолодая, с очень скромным достатком женщина. И вот на склоне лет в родном гнезде человек вдруг почувствовал себя, как в заячьей избушке, — беззащитным, бесправным, беспомощным. Маленькая, худенькая, нервная, она измождена трехлетней борьбой с невидимым гигантским противником — правовой системой, которая даже щели не оставила ей, чтобы проникнуть в могущественный свод законов и попытаться найти тот рычаг, который поможет повернуть судебную машину в защиту ее прав.

Светлана Тимофеевна написала объемное письмо в редакцию, где и по первым строчкам чувствуется степень ее психологической взвинченности: **“Я вынуждена обращаться с криком моей души обоснованно и по существу. Нет предела гневу и возмущению!”** Это письмо она лично привезла из Орши в редакцию, с шести утра ожидая журналистов под дверью. Отчаяние заставляет некоторых людей идти на крайнее напряжение всех физических сил. Но удивительно другое — способность выдерживать высокий накал буквально годами, несмотря на болезни и возраст. Так, чтобы принести жалобу в Администрацию президента, Данченко, например, даже ночевала на минском вокзале. Светлана Тимофеевна готова на жертвы: не спать, не есть, биться, бороться, доказывать... Она, признаться, поразила меня своей непреклонностью. Непреклонностью, как мне думается, себе же во вред.

Но, как говорится, хорошо мне рассуждать со стороны. А ей каково? Ее старенький дом на улице Лепешинского в Орше начали строить еще ее родители в 1947 году. Но отец через год погиб. Стройка осталась на женских плечах... Сейчас дом выглядит скромным, если не сказать довольно жалким строением, особенно по нынешним меркам и представлениям о комфорте. Но, собственно, что и на какие средства могла построить после войны мать — вдова с тремя детьми на руках?

Светлана Тимофеевна до сих пор помнит, как несколько лет она и сестры, три маленькие девочки, жили в доме без пола и потолка — не было денег закончить строительство. Как было холодно, как все время хотелось есть... А младшая сестра Лариса была вечно перемазана куриным пометом — две курицы ходили рядом, грелись с ними под одной крышей. В общем, бедности хлебнули они полным черпаком. Дом для своих детей мать буквально бревно за бревном отвоевывала у судьбы. Как теперь Светлане Тимофеевне, последней оставшейся в живых дочери, согласиться, что родные стены надо поделить с чужаком?

А вот приходится. Правда, Сергей Александрович Дешкович, как я уже говорила, в доме не живет, на жилплощади физически не пребывает. Он лишь зафиксирован наследником 1/3 доли собственности, что досталась ему от брата, который был женат на младшей сестре Светланы Тимофеевны Данченко — Ларисе. Прожив в браке только три года, сорокалетняя женщина умерла, не оставив завещания. А потом трагически погиб и ее муж, брат Сергея Александровича. Так и приплыло в руки наследство — часть дома по улице Лепешинского, 39. И хотя семье Данченко С.А.Дешкович совершенно посторонний человек, они никогда, как говорит женщина, друг друга даже не видели, от своих прав на наследство и прописку в доме мужчина отказываться не стал. Ведь дом хоть и жалкий, но расположен в центре города, и участок при нем есть около 5 соток. Если его будут когда-нибудь сносить, всем прописанным гражданам государство возместит ущерб. Словом, была бы собственность, а вариантов, как ею распорядиться, множество.

Я обрисовала канву ловушки, в которую на старости лет попал пожилой человек. Естественно, С.Т.Данченко кинулась искать защиту в суде. Но суд отказал в иске, и адвокаты от этого дела бегут, как от огня, считая, видимо, его бесперспективным и муторным. Единственное, за что может побороться Светлана Тимофеевна, это за потерянные льготы при оплате жилплощади. Агрессивно (то есть без уведомления хозяйки), хотя и по праву прописавшись по адресу Лепешинского, 39, трудоспособный Дешкович автоматически лишил тем самым инвалида Данченко льгот на коммунальные услуги. С некоторых пор суммы в жировках на воду, электроэнергию и газ стали приходить женщине в несколько раз большие, чем раньше. Эти траты достаточно ощутимы для ее пенсионного бюджета да и оскорбительны для нее как для человека. Мало того, что на твою кровную собственность претендует кто-то чужой, так, получается, еще и плати за это из своего кармана! Данченко уже несколько раз обращалась в коммунальную службу Орши с жалобой: разберитесь, верните льготы, мы ведь не родственники с новым жильцом! Но машина ЖКХ неповоротлива и к людям довольно равнодушна. Впрочем, в данном случае, думаю, газета сможет помочь женщине добиться исправления технической ошибки.

Я пытаюсь понять чувства Светланы Тимофеевны. Наверное, ей кажется, будто оказалась на дне глубокого холодного колодца. Взывает о помощи, но все слова возвращаются эхом обратно. В какую сторону ни кинься, везде гладкая кладка законов, и разрушить их никто не в состоянии. Ведь юридически все вроде бы чисто. Но вот по человеческим понятиям, по тем высоким неписаным правилам...

Как ни поворачивай, ни смотри на ситуацию, приходится признать, что буква закона и элементарная гуманность в данном случае находятся в противоречии. И такие тупики не редкость в жизни, разве не так? Напротив, все людское существование в обществе соткано из многих жестких узлов, порой неразрешимых конфликтов, явных и скрытых нелогичностей. Закон пытается их сгладить, примирить или подчинить нас действительности. Он суров, да, но — не всесилен. Надо признать, что иногда нам просто приходится закрывать глаза на проблему, потому что идеальных, стерильных ситуаций не добиться на земле. Поэтому христианство учит: смирение — большая добродетель. Именно оно, по большому счету, и есть путь к настоящей гармонии на земле. Счастлив тот, кто умеет легко расставаться с бренной собственностью, не привязывать себя к ней иллюзорными пудовыми гирями, канатами.

Теперь Светлана Тимофеевна живет, каждую минуту ожидая нападения из внешнего мира. Она говорит:

— Около моего дома стали часто останавливаться автомобили. Вы думаете, это случайность? Но я запоминаю номера...

— Мне кто-то вечером стучал в дверь. Я спросила: “Кто?” Представляете, ответили: “Свои!” Я, конечно, не открыла.

— Соседка обрезала мою вишню, что лезла ей через забор... Я — беззащитна!

— Пьяный поломал калитку, говорит, ошибся домом. Но я-то понимаю, почему он ко мне ломился...

Я попыталась предложить Светлане Тимофеевне выход из ситуации, который подсказывает сердце:

— Забудьте о чужом наследнике. Не превращайте свою жизнь в ад на земле. Смотрите, как красиво цветут у вас вишни... Даже ради солнца, весны, скамейки в саду, где можно сесть и полистать ваш семейный фотоальбом, уйдите с тропы борьбы! Вы были такой красивой женщиной, вас любил муж... Разве этого мало? Вашего “прописанта” вы вряд ли увидите до конца жизни. И, собственно, не все ли равно, что будет потом с этим старым домом? Все на этой земле прах, все превратится в тлен и пыль.

Возможно, слова мои прозвучали слишком дерзко. Потому что моя собеседница посмотрела на меня с мрачным подозрением:

— А вы и правда из газеты? Я сейчас вашему редактору позвоню.

Елена МОЛОЧКО.

Орша—Минск.

ПА ЧУТКАХ І...

Куды падзяваліся бамжы і хранічныя алкаголікі са сталічных вуліц?

Па горадзе паўзуць розныя чуткі...

Маладзёжны актывіст **Павел ВІНАГРАДАЎ** пасля “адсідкі” ў ізалятары часовага ўтрымання на вуліцы Акрэсціна распавядае:

— Нямала бамжоў адлавіла міліцыя напярэдадні хакейнага чэмпіянату. Падчас спецаперацыі іх вывозілі за 100 кіламетраў ад Мінска. Ніякіх пратаколаў не складалі, проста выкідвалі і ўсё. Але потым атрад бамжоў пехам дружна дабіраўся назад у Мінск. Тады за іх — і на Акрэсціна.

Многіх хранічных алкаголікаў яшчэ за паўгода да чэмпіянату накіравалі ў ЛПП, каб не бадзяліся па горадзе і не псавалі святочную карціну”.

Яшчэ адзін актывіст **Дзяніс КАРНОЎ** выйшаў з Акрэсціна літаральна днямі, адседзеўшы 20 сутак арышту. Ён расказвае, што за гэты час спецпрыёмнік папоўнілі “жрыцы кахання”.

— Хутчэй за ўсё гэта далёка не так званыя элітныя прастытуткі, а больш танныя, якія могуць “працаваць” на вакзалах ці на трасах. Спачатку на нашым чацвёртым паверсе была адна жаночая камера, а потым за адну ноч дадалася і другая. Нас вадзілі на шпацыр, і мы мелі магчымасць назіраць, як на іншых паверхах камеры запаўняліся жанчынамі. Так, на другім паверсе можна было бачыць, што перад камерамі стаялі па 5—6 пар абутку. Хаця на Акрэсціна, заходзячы ў камеру, разувацца не трэба. Але гэтых жанчын пахапалі літаральна “з працы”, у экіпіроўцы, абутак — высачэзныя шпількі. Таму, напэўна, і забаранілі такія небяспечныя прадметы трымаць у камеры, прымусілі разуцца. А побач з туфлямі на абцасах ляжалі, напрыклад, чырвоныя стрынгі. Відаць, супрацоўнікі ізалятара палічылі, што імі можна скарыстацца як удаўкай, і на ўсялякі выпадак таксама прымусілі зняць і пакінуць у калідоры. Ад граху далей. Так што магу засведчыць: толькі на адным паверсе ў камерах пры мне трымалі пад 60 жанчын. Дарэчы, трымалі таксама двух спартыўных фанатаў і аднаго нацбола. Ён там заўсёднік, і яго ўсе канваіры добра ведаюць. Дарэчы, супрацоўнікі ізалятара, мяркуючы па іх паводзінах, таксама прайшлі інструктаж — вадзілі на шпацыр, у душ раз на тыдзень і нават дазвалялі раз за гэты час змяніць бялізну. Такі прагрэс! А вось на першым паверсе сапраўды былі бамжы, і яны распавядалі, што іх трымаюць не толькі на Акрэсціна, але і ў нейкіх падвалах. Ім там не даюць памерці з голаду, але на час чэмпіянату нікога не адпусцяць. Можа, гэта і страшылкі, а можа, і праўда, — кажа Дзяніс.

Такім чынам, сапраўды, на сталічных вуліцах бамжоў цяпер не ўбачыш, п’яніцы таксама пахаваліся па дварах і кватэрах. А вось з прастытуткамі сітуацыя не зусім зразумелая — чым тыя, якія трапілі ў ізалятар, горшыя за тых, якія “працуюць” пры гатэлях?.. А яны працуюць...

Любоў ЛУНЁВА.

НА БУКСІР

Імперыя Шакуціна разрастаецца

*У холдынг “Амкадор”, які падкантрольны сенатару **Аляксандру Шакуціну,** у хуткім часе ўвальецца Дзяржынскі вопытна-механічны завод.*

Такое рашэнне прадугледжана распараджэннем, якое падпісаў Аляксандр Лукашэнка. Фінансавыя ўмовы здзелкі не агалошваюцца, але вядома, што “Амкадору” трэба будзе інвеставаць у развіццё стратнага дзяржпрадпрыемства ў 2014—2018 гадах не менш за 50 мільярдаў рублёў. Акрамя таго, “Амкадор” будзе абавязаны забяспечыць да 31 снежня 2018 года *“пагашэнне запазычанасцяў набытага прадпрыемства; тэхнічнае перааснашчэнне вытворчасці, укараненне сучасных тэхналогій, пашырэнне відаў выпускаемых кранаў і іншай грузападымальнай тэхнікі; павелічэнне колькасці работнікаў да 240 чалавек; павелічэнне ў 2 разы аб’ёмаў прамысловай вытворчасці ДВМЗ да ўзроўню 2012 года; павышэнне сярэднямесячнай заработнай платы да рэспубліканскага ўзроўню”.*

У часы СССР Дзяржынскі вопытна-механічны завод займаўся вытворчасцю кранаў і розных прыстасаванняў для будаўнічай галіны. Штогод выпускалася звыш 60 кранаў рознай грузападымальнасці. Пасля распаду Савецкага Саюза скарацілася колькасць заказаў. Людзі сталі сыходзіць з завода. У выніку да 2008 года колькасць персаналу знізілася з 600 да 150 чалавек. Прадпрыемства, якое знаходзілася ў ведамасным падначаленні Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, стала “стабільна стратным”. Шматмільярдныя даўгі мінулых гадоў спараджалі новыя абавязацельствы. Апошнім часам на заводзе заставалася ўсяго каля 90 работнікаў. Многія з іх на пачатку года падпісалі ліст да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай *“у максімальна сціслы тэрмін разгледзець і падпісаць указ аб нашым пераходзе ў склад ААТ “Амкадор”.*

ОПРОС

За невысокую зарплату на гарантированной работе!

(Окончание. Начало на 1- стр.)

Вопрос о сравнительной эффективности различных форм собственности, естественно, оказался политизированным. Среди сторонников А.Лукашенко (доверяют президенту) считают более эффективной государственную собственность 61,2% респондентов, среди противников А.Лукашенко (не доверяют президенту) — 16,7%. Что касается частной собственности, то здесь обратная картина — 28,3% и 73,6% соответственно.

Но одно дело выражать свое отношение к “*измам*” и базовым формам собственности, и совсем другое — учитывать форму собственности предприятия при выборе места работы. В 1997 г. большинство белорусов предпочло бы государство в качестве работодателя (табл.2). В годы экономических кризисов (2009 г. и 2011 г.), когда ощущение незащищенности повышается, большинство белорусов пытается искать защиту под крылом государства, что, естественно, повышает желание работать на государственных предприятиях.

Таблица 2. Динамика ответов на вопрос “На каком предприятии вы хотели бы работать?”, %

Вариант ответа	11’97	06’06	09’07	10’08	09’09	09’10	03’11	03’13	03’14
На государственном	53.5	52.0	47.9	44.9	44.1	42.6	43.0	40.5	40.2
На частном	35.7	33.0	39.3	33.1	28.0	32.9	36.2	41.0	41.1

За прошедший год привлекательность предприятий государственной и частной форм собственности практически не изменилась, что свидетельствует об относительной стабильности белорусской экономики с точки зрения общественного мнения. Но это в среднем по опросу. Среди сторонников А.Лукашенко преобладают желающие работать на государственных предприятиях — 56,2% vs. 22,2%. Среди его противников зависимость обратная — 24,8% vs. 60,7%.

Молодые люди в возрасте 18—29 лет предпочитают работать на частных предприятиях (63,5%), но ветераны труда, чей возраст приближается к пенсионному (40—49 лет), — на государственных (23,3%).

Уровень образования на выбор респондентов влияет незначительно. В частности, на государственных предприятиях желают работать 48,9% белорусов с начальным образованием, 48,4% с незаконченным средним, 38,3% со средним, 37,1% со средним специальным и 41,1% с высшим.

В очередной раз приходится отмечать, что среди белорусов с высшим образованием велика доля госслужащих и бюджетников, что не может не сказаться на их предпочтениях при выборе места работы.

Ответы на вопрос “Приходилось ли вам участвовать в негосударственной экономической деятельности?” позволяют нам оценить динамику экономической активности белорусов за последние 20 лет (табл.3).

Таблица 3. Динамика ответов на вопрос “Приходилось ли вам участвовать в негосударственной экономической деятельности?”, % *(возможно более одного ответа)*

Вариант ответа	11’94	03’14
Наемный труд в негосударственном секторе	9.9	24.7
Перепродажа товаров	19.6	16.9
Индивидуальная трудовая деятельность	17.7	14.5
Приобретение ценных бумаг (акций и т.п.)	5.9	6.5
Владение (совладение) предприятием, фирмой и т.д.	3.2	2.9
Другое	2.3	4.8

Если исключить первый вариант ответа (“Наемный труд в негосударственном секторе”), то можно легко прийти к заключению, что белорусское общество застыло в своем развитии. И это не ошибочное заключение. Белорусская модель блокирует экономическую активность общества, и ее архитекторы делают это сознательно. Потому что они не умеют выстраивать отношения со свободными и независимыми людьми.

Все, что способно “шевелиться” самостоятельно вне контроля властной “вертикали” (не имеет значения, идет ли речь о политической, экономической или социальной активности), систематически уничтожается или, в лучшем случае, маргинализуется.

В результате единственным субъектом экономики в Беларуси остается бюрократия. Ее способность модернизировать государственные предприятия была наглядно продемонстрирована в “переломном” 2013 году.

Все сказанное выше подтверждается и ответами на вопрос табл.4. Благодаря усилиям патерналистского государства доля белорусов, предпочитающая невысокую, но гарантированную зарплату, за 22 года не только не сократилась, но, напротив, увеличилась.

Таблица 4. Динамика ответов на вопрос “Что бы вы выбрали?”, %

Вариант ответа	04’92	03’14
Высокий заработок, но с высоким риском потерять работу	51.4	47.1
Невысокую зарплату на гарантированной работе	45.9	51.8
НО	2.7	1.1

Опираться, как известно, можно лишь на то, что оказывает сопротивление. Для авторитарной власти безынициативный, зависимый человек, безусловно, очень удобен. Но белорусская модель, как бы к ней ни относиться, функционирует в условиях внешней конкуренции. Российские дотации в определенной степени остроту конкуренции снижают, но не более того.

Вот и приходится А.Лукашенко метаться по стране с целью ликвидации “бардака” и “наведения элементарного порядка” на государственных предприятиях. Сами же работники государственных предприятий обеспокоены лишь возможной потерей гарантий на получение невысокой зарплаты. К “бардаку” они привыкли, он их не раздражает.

www.iiseps.org

СТАЛІЦА

Не хапае медсясцёр, прыбіральшчыц і інжынераў

Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама апублікаваў спіс самых запатрабаваных спецыялістаў у Мінску. Высветлілася, што ў дэфіцыце прадстаўнікі розных прафесій. Але найбольш катастрафічная сітуацыя назіраецца ў ахове здароўя. Па-ранейшаму нашым бальніцам і паліклінікам не хапае ўрачоў і медыцынскіх сясцёр. Дэфіцыт малодшага медперсаналу хутка наблізіцца да тысячы чалавек. Так, на 1 красавіка свабоднымі заставаліся 958 вакансій медыцынскіх сясцёр. Яны і ўзначалілі спіс самых запатрабаваных спецыялістаў у Мінску.

Далей ідуць:

прыбіральшчыкі памяшканняў (802 вакансіі),

інжынеры (580).

вадзіцелі аўтамабіляў (579 вакансій)

муляры (511),

урачы (447),

прадаўцы (342),

маляры (299),

слесары-рамонтнікі (274),

швачкі (224),

грузчыкі (208),

слесары-сантэхнікі (198),

кантралёры-касіры (194),

рабочыя па комплекснай уборцы (146).

Зразумела, што не хапае спецыялістаў там, дзе мала плацяць. Так, зараз сярэдняя зарплата медсясцёр і швачак складае прыблізна 4 мільёны рублёў, вадзіцеляў і інжынераў — 7 мільёнаў.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Крымінальная цікаўнасць

У панядзелак падчас судовых спрэчак дзяржабвінаваўца запатрабаваў прызначыць былому дырэктару кандытарскай фабрыкі “Слодыч” **Таццяне Селіх** пакаранне ў выглядзе пяці гадоў пазбаўлення волі.

Слуханні па гэтай скандальнай справе заканчваюцца ў судзе Першамайскага раёна Мінска. Нагадваем, што былы дырэктар абвінавачваецца ў тым, што незаконна праслухоўвала падначаленых.

“Прашу прызначыць пакаранне ў выглядзе пяці гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму”, — сказаў пракурор у сваёй прамове ўчора. Ён таксама запатрабаваў пазбавіць Таццяну Селіх права займаць пэўныя пасады тэрмінам на пяць гадоў.

Акрамя таго, дзяржабвінаваўца паведаміў, што Таццяна Селіх праслухоўвала перамовы супрацоўнікаў праз свой працоўны камп’ютар, да якога было падключана адпаведнае абсталяванне. На камп’ютары спадарыні Селіх захоўваліся і аўдыёзапісы размоў.

Слуханне гэтай незвычайнай справы пачалося 28 красавіка. На судзе былы дырэктар прадпрыемства вінаватай сябе не прызнала.

НА СВАБОДУ!

Вызваленне ў гонар... вызвалення

Закон аб амністыі ў сувязі з 70-годдзем вызвалення Беларусі прыняты ў першым чытанні. Згодна з ацэнкай Міністэрства ўнутраных спраў, па амністыі з турмаў і калоній могуць быць вызвалены каля 2100 чалавек, яшчэ больш за 600 — з папраўчых устаноў адкрытага тыпу.

Цяжкахворых, цяжарных, непаўнагадовых злачынцаў, а таксама ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыях іншых краін будзе вызвалена каля 100 чалавек. Гэтыя ж катэгорыі асоб, згодна з праектам закона, могуць быць вызвалены ад крымінальнай адказнасці, калі трапілі пад следства ці суд.

50 асуджаных за злачынствы, якія не ўяўлялі вялікай грамадскай бяспекі, таксама могуць збіраць рэчы дадому. Паводле дадзеных МУС, зараз яны адбываюць пакаранне на “хіміі”.

Тыя, хто асуджаны за злачынствы, аднесеныя ў Крымінальным кодэксе да катэгорыі “менш цяжкіх” (прыгаворы не больш за 2 гады), таксама трапілі пад амністыю. Праўда, пры ўмове, што не менш за чвэрць тэрміну пакарання яны ўжо адбылі. Чакаецца, што такіх будзе 400 чалавек у калоніях і 200 — на “хіміі”.

Дзяржава літуецца таксама над асобамі, асуджанымі за крадзеж, махлярства, крадзеж са злоўжываннем службовымі паўнамоцтвамі, прысваенне ці растрату, незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, ухіленне ад уплаты падаткаў і збораў. Умова такая: на дзень уступлення закона аб амністыі ў моц гэтыя людзі павінны адбыць хоць трэцюю частку тэрміну пакарання. Паводле разлікаў, такіх “шчасліўцаў” будзе 400 чалавек у беларускіх калоніях і яшчэ 100 — ва ўстановах адкрытага тыпу.

Ад адбыцця пакарання вызваляюцца таксама тыя, каму засталося сядзець менш за год.

Такім чынам, на волю з турмаў і калоній па амністыі выйдзе не так ужо шмат людзей. Хаця пад амністыю трапіць значна большая колькасць асуджаных: згодна з законам, прыблізна пяці тысячам чалавек тэрміны пакарання будуць зменшаны на адзін год.

Дарэчы, беларускія палітзняволеныя могуць выйсці на волю па амністыі, а могуць і не выйсці. Калі яны будуць прылічаны да “злосных парушальнікаў” рэжыму папраўчых устаноў, то ім, згодна з праектам закона, нічога добрага не свеціць. Хоць усім вядома, як у турмах накладваюць спагнанні на тых, каго праваабаронцы лічаць палітзняволенымі.

ЧУЛІ?

У Беларусі хочуць увесці сакрэтны кантроль у сетках электрасувязі

З ініцыятывай выступае Міністэрства ўнутраных спраў. Мэтай называецца выяўленне карупцыянераў.

Пра гэта паведаміў міністр унутраных спраў **Ігар Шуневіч** у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Міністр кажа, што цяпер у аператыўных мэтах супрацоўнікі праваахоўных органаў выкарыстоўваюць такія метады негалоснага кантролю, як праслухоўванне тэлефонных размоў ды іншыя. Шуневіч заяўляе, што *“закон накіраваны на выяўленне цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, у тым ліку і карупцыйных, якія з’яўляюцца высокалатэнтнымі”.*

О правозащитной системе в нашей стране писано-переписано. О том, что она подлежит основательному реформированию, свидетельствует и подборка материалов этой страницы. “Народная Воля” готова предоставить возможность изложить свою позицию всем фигурантам ***«дела Марии Шапловой»***.

Не бойся суда, бойся судей

Я никогда не писала в газеты. Это мое первое обращение.

И главным побудительным мотивом такого шага явилось не желание пожаловаться на причиненные мне обиды, унижения и страдания, а стремление рассказать людям правду, что, по моему мнению, будет способствовать недопущению подобного в отношении других наших граждан.

С помощью “Народной Воли” и представленных мною документов я хочу довести до сведения читателей конкретные факты, свидетельствующие о том, как наши суды “защищали” мои интересы.

Работая на Смолевичской бройлерной птицефабрике в течение 32 лет, я, как и другие честные труженики, занимаясь реальной производственной деятельностью, платила налоги, которые шли в том числе и на содержание судей, как, впрочем, и всей правоохранительной системы.

И вот меня уволили с должности главного бухгалтера Смолевичской бройлерной птицефабрики. Сразу скажу — уволили за отказ искажать государственную статистическую отчетность. Так, за девять месяцев 2011 года предприятие сработало с прибылью более 19 миллиардов рублей. С.Рамченко, пришедший на птицефабрику вместо уволенного П.Шагова, сразу же запретил мне отражать объективные статистические данные, потребовав их искажения. Я, безусловно, не могла пойти на это. Тогда за подписью других лиц в статистические органы пошел отчет о том, что за 10 месяцев этого же 2011 года предприятие работало с убытком, равным 21 миллиарду 891 миллиону рублей. Получается, что якобы птицефабрика всего за один месяц скатилась до таких показателей.

Отказываясь составлять и подписывать фиктивный статотчет, я понимала, что защищаю интересы своего коллектива и государства в целом. К этому времени я уже знала, что фабрику собирается “прихватизировать” некий Женя Баскин, выкупить ее за бесценок, для чего требовалось уменьшить активы предприятия.

При таких обстоятельствах, будучи уверенной в своей правоте и порядочности поступка, я вправе была рассчитывать и рассчитывала, что со стороны государства, а именно правоохранительных органов, получу поддержку и защиту.

Сначала я обратилась в суд Смолевичского района с иском о восстановлении на работе, а получив отказ, прошла с жалобами все судебные инстанции.

Не пожелаешь и врагу, что мне довелось испытать. Суды мне причинили боль не меньшую, чем Рамченко (кто такой — будет сказано ниже) и Баскин.

Прокуроры, когда давали заключения о правильности моего увольнения, хоть опускали глаза при этом.

Но вот судья Е.Мисник... У нее не дрогнул ни один мускул. А ведь она-то знала, что выносит незаконное решение. В этом нет никаких сомнений. В кассационном и надзорном порядке это решение оставили без изменений судьи С.Далинчук, А.Карпович и Г.Комель, а также председатель областного суда В.Крайко.

Особую надежду я возлагала на Верховный суд. Однако заместители председателя Верховного суда А.Забара и А.Федорцов дали мне просто отписки с выводами, которые противоречили материалам дела.

После этого я написала третью жалобу на имя председателя Верховного суда В.Сукало, в которой просила лично ознакомиться со всеми тремя жалобами, где, оспаривая вмененные мне нарушения, подробно и, полагаю, аргументированно, со ссылкой на представленные документы и конкретные факты, доказывала абсурдность этих обвинений.

Думала, что, наконец, Валентин Олегович разберется и примет предусмотренные законом меры для отмены решения суда. Во всяком случае закон обязывал его дать ответы на мои доводы.

Вот копия моей последней жалобы и ответ на нее.

Як паведамлялася раней, плануецца, што ў гэтым годзе ў санаторыях Беларусі адпачнуць больш за 1,3 мільёна чалавек, у тым ліку каля 700 тысяч за кошт сродкаў бюджэту і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Прыкладна 60% пуцёвак набываецца замежнымі грамадзянамі, у асноўным жыхарамі Расіі (да 90%).

У мінулым годзе ў беларускіх санаторыях адпачыла больш за 230 тысяч іншаземцаў. Для параўнання: у 2008 годзе ў беларускіх санаторна-курортных арганізацыях прайшло лячэнне і аздараўленне 106 тыс. замежнікаў, у 2009-м — прыкладна 130 тыс. чалавек.

Алена СПАСЮК.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20 МАЯ 2014 г.

ЭКАНОМІКА

Дапаможам аэрапорту...

З 1 чэрвеня пасажыры Нацыянальнага аэрапорта пры вылеце з Беларусі будуць плаціць збор на развіццё інфраструктуры аэрапорта.

Гэта рашэнне прынята на ўзроўні ўрада і падмацавана пастановай Савета міністраў №459. Згодна з дакументам, збор будуць плаціць і дарослыя, і дзеці — 5 і 2,5 долара адпаведна. Даплата будзе дадавацца да кошту білета пры яго продажы. Ад збору вызваляць толькі дзяцей, якія едуць па гуманітарных праграмах, а таксама транзітных і трансферных пасажыраў.

Журналісты ўжо падлічылі, што нават за сёлетнія паўгода аэрапорт можа зарабіць на зборы каля 2 млн долараў. Пагадзіцеся: немалыя грошы за наш кошт. Так можна шмат чаго рэканструяваць і развіваць у краіне. Невядома, ці абмяжуюцца ўлады толькі развіццём інфраструктуры аэрапорта за кошт пасажыраў?

ТУРЫЗМ

Амаль 400 тысяч чалавек наведалі Нясвіжскі замак

У тройку самых папулярных беларускіх музеяў у 2013 годзе ўвайшлі Нясвіжскі замак, Брэсцкая крэпасць і палац Румянцавых—Паскевічаў у Гомелі. Такія дадзеныя прыводзіць Нацыянальны статкамітэт.

Так, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" наведала летась 395,2 тысячы турыстаў, мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" — 387,6 тысячы, а Гомельскі палацава-паркавы ансамбль — 300 тысяч.

Сярод папулярных музеяў таксама замкавы комплекс "Мір", Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, дзяржаўны мемарыяльны комплекс "Хатынь".

Усяго ў 2013 годзе музеі Беларусі наведалі 5,7 млн чалавек. Гэта на 44,1% больш, чым у 2005 годзе. Зараз у Беларусі працуюць 162 музея рознага профілю: гістарычныя, комплексныя, мастацкія, літаратурныя, галіновыя.

ЧУЛІ?

Бывай, біятлон!

Адразу тры беларускія біятланісты — Сяргей Новікаў, Уладзімір Алянішка і Яўген Абраменка — абвясцілі пра завяршэнне кар'еры, паведаміла крыніца ў федэрацыі біятлона Беларусі.

Цікава, што Уладзіміру Алянішку 8 сакавіка споўнілася ўсяго 25 гадоў. Новікаў скончыў з біятлонам у 35 гадоў, Абраменка — у 27.

ПРОДАНО!

Участок в Раубичах купили за 66 тысяч долларов

Земля под Минском по-прежнему в цене.

На недавнем аукционе в Минском районе участок в д.Лусково Юзуфовского сельсовета (недалеко от пос.Городище) был продан за 420 миллионов рублей, что по нынешнему курсу составляет 42 тысячи долларов. Немалая сумма для участка в деревне, оснащенного только электричеством. Причем борьба за эту землю шла нешуточная. В ходе торгов цена на лот поднялась почти в шесть раз и выросла с 281 до 420 миллионов.

К слову, самый дорогой участок аукциона (в д.Раубичи) тоже подорожал в ходе торгов. Обладателю он достался за цену в 1,5 раза выше первоначально выставленной. Правда, этот участок оснащен электричеством, к нему подведен газ.

Также на аукционе продавались участки в агрогородке Ратомка, в Заславле и других. И если учесть, что, например, в Ратомке — это был просто кусок земли без коммуникаций, то продан он тоже недешево — за 290 миллионов.

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

Татьяна Бондарчук уехала работать в Россию

Бывший директор "Белгосцирка" Татьяна Бондарчук уехала в Санкт-Петербург. "Бондарчук возглавила один из цирков в Санкт-Петербурге", — сообщили агентству "Интерфакс-Запад" источники в цирковых кругах.

Как известно, весной 2013 года в отношении Бондарчук было возбуждено уголовное дело по подозрению в злоупотреблении служебными полномочиями. Но в конце года она в полном объеме возместила ущерб и подала ходатайство об освобождении от уголовной ответственности. В Следственном комитете РБ тогда отметили, что, *"принимая во внимание активное сотрудничество обвиняемой со следствием в части установления фактических обстоятельств дела, признание собственной вины и в связи с добровольным возмещением причиненного ущерба и уплатой дохода, полученного преступным путем, обвиняемой в установленном порядке заявлено ходатайство об освобождении ее от уголовной ответственности".*

Кстати, это было не первое уголовное дело, фигурантом которого становилась Татьяна Бондарчук, будучи директором "Белгосцирка". В 2000 году она была задержана по подозрению в получении взятки размером почти 5 тыс. долларов, но потом освобождена из-под стражи.

РОЗДУМ

Ніл ГІЛЕВІЧ

Спынім крокі да сваёй нацыянальнай смерці!

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч падрыхтаваў да друку свайго роду дадатак да завершанага збору твораў у 23 тамах. Гэта — запісы з нязводнага думання аб жыцці-быцці, якія аўтар вёў на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Прапануем чытачам "Народнай Волі" фрагменты з гэтай новай кнігі, якую аўтар назваў "У віры быцця".



"Что вы, братцы-белорусы, за люди?.."

Помню, зайшоў да мяне ў Саюзе пісьменнікаў паэт з Браншчыны. "Слушайте, недавно у нас был ваш белорусский поэт... Извините, но он абсолютно всех вас оплевал, вы все бездари, дерьмо и т.д. Что вы, братцы-белорусы, за люди?.."

Ужо колькі гадоў думаю і думаю аб гэтым: што мы, беларусы, за людзі? Адкуль у нас гэтае самаедства? Ад таго, што ў стагоддзях былі халуямі, слугамі, чэляддзю? Ад зайздрасці, што большы кусок з панскага стала дастаўся не мне? Чаму рускія пісьменнікі яўрэйскай нацыянальнасці гарой стаяць за сваіх аднапляменнікаў? Гэтак жа — і армяне, і грузіны, і азербайджанцы, і летувісы, і эстонцы. Падчас пленума СП СССР у Маскве масціты паэт Арсеній Таркоўскі звярнуўся да мяне з просьбай: "Поддержите поэта Вениамина Блаженного. Он очень талантливый, а его в Минске обижают..." Тады ж Канстанцін Ваншэнкін, з якім мы асабіста не былі знаёмыя (як і з Таркоўскім), падышоў і сказаў мне: "Слушайте, у вас есть такой прекрасный поэт Наум Кислик, а вы, белорусы, его недооцениваете, не помогаете с изданием книги..."

Вось як трэба, браткі-беларусы! Вось у каго трэба вучыцца павазе і любові да сваіх аднапляменнікаў! А не аплёўваць і не абзываць дзярмом.

1988

А гвалтаўнікі нашай Маці ўшанаваны

Ландар і Мяснікоў былі зацятымі ворагамі незалежнай Беларусі і беларускага народа. Можна падумаць, што сябрамі і абаронцамі суверэннай Беларусі былі бальшавіцкія фанатыкі Валадарскі, Урыцкі або нямецкія бальшавікі Лібкнехт, Люксембург... Чаму ж іх імёнамі ў нашых гарадах названы вуліцы? Чаму? Хто мы і дзе мы жывём, людзі? Чаму дагэтуль церпім здзек з нашай нацыянальнай годнасці? Можаце ўявіць: сын маці, якую гвалціў і мучыў нехта, павесіў у сваім доме партрэт гэтага гвалтаўніка? Не можаце такое ўявіць? А чаму ж імёны гвалтаўнікоў Маці-Беларусі ўвекавечаны на вуліцах сталіцы і іншых гарадоў краіны? Як жа трэба не паважаць сябе і не любіць Маці, каб дазволіць такое ў сваім Беларускім доме?

А тым часам вуліц, названых імёнамі выдатных сыноў і дачок Беларусі, ні ў сталіцы, ні ў іншых гарадах краіны няма. Няма вуліцы акадэміка Ігнатоўскага, вуліцы Лёсіка, вуліцы Некрашэвіча, вуліцы Ластоўскага... Жахліва, неверагодна жахліва, але... вялікі беларускі паэт Алесь Гарун не ўвекавечаны ў родным Мінску! "Ты, мой брат, каго зваць беларусам, Роднай мовы сваёй не цурайся!.." Гэта — пачатак верша Гаруна. Гэта і прычына, чаму ў нас няма вуліцы Гаруна.

1991

Справа не ў партыйнасці...

Сёння многія нашы грамадзяне, асабліва маладога веку, бязбожна абсалютызуюць факт партыйнай прыналежнасці. На першае месца ставіцца пытанне — хто ты: ці былы член КПБ, ці не? Калі не — будзем з табой мець справу, калі ж былы — усё. Прэч! Ніякай размовы! Такі падыход не вытрымлівае крытыкі. Спадары не хочуць думаць, што ў нашым грамадстве, пры нашым узроўні культуры, маралі, пачуцця чалавечай годнасці і гонару пытанне аб партыйнай прыналежнасці вельмі і вельмі адноснае. Хочаце пераканацца? Паглядзіце, як лёгка, ані чмыхнуўшы, тысячы камуністаў перакінуліся, абярнуліся ў заўзятых антыкамуністаў. Паглядзіце, хто сёння паспеў у прыватным бізнесе стаць мільянерам? Хіба не былыя партакраты, высокія партыйныя саноўнікі? Побач з тымі, вядома, хто ніколі партакратам не быў, наогул не быў у партыі, але заўсёды быў хапугам і злодзеем, у адрозненне ад першых — беспартыйным хапугам і злодзеем. Цяпер яны працвітаюць ці пачынаюць працвітаць разам — на вачах "не здольных" да такога працвітання, на вачах няшчасных, аб'яднаных жабрацкай роўнасцю і беспартыйных, і былых партыйцаў (членаў КПБ). Паглядзіце, нарэшце, на некаторых членаў новаствораных партый — на тых, што сёння маюць уладу або проста маюць магчымасці: можа, яны вылучаюцца ўзорнай маральнасцю, высакароднасцю, сціпласцю, можа, яны начыста пазбаўлены "хапальных рэфлексаў", можа, яны зусім не здольныя пакарыстацца гэтак званымі "зручнасцямі" быту, радасцямі жыцця, раскошай?

Ну, што вы, што вы! Роўненька гэтак, як і былыя партакраты з ЦК, АК, ГК і РК КПБ, умеюць і яны паклапаціцца пра сябе, пра сябе і яшчэ раз пра сябе. А ўявіце, калі ім даць поўную ўладу? Як яны ёй пакарыстаюцца?

Таму і не трэба, не трэба, шаноўныя, захапляцца змагарствам на партыйна-палітычнай аснове. Напэўна, мала сэнсу гаварыць пра маральны абавязак тым, хто ўжо сёння сыта ласніцца ад шчасця, ад радасці за свой квітнеючы бізнес, ад задаволенасці жыццём, лёсам. Наўрад ці можна спадзявацца, што забаліць іх душа за абяздоленых, за тых, хто сёння апынуўся ў жабрацкай беднасці, у бяспраўі. "Так ім, сумленным дурням, і трэба!" — не кажуць уголас, але думаюць разумнікі.

Так што справа не ў партыйнасці, справа — у здольнасці хапаць і красці.

1992

Як жа лезе-вылазіць яна!..

Страшна бессаромныя лісты са скаргамі на Камісію па адукацыі і культуры прыходзяць у Вярхоўны Савет краіны. Пішуць: "Беларусь заўсёды была білінгвістычнай (двухмоўнай), такой яна павінна быць і далей".

Павінна быць і далей? Паглядзіце самі сабе ў вочы, панове! Яшчэ два-тры дзясяткі гадоў — і ўсё! Ніякага двухмоўя! Канчаткова запануе адна — руская! Пішуць: "Рускую мову выганяюць са школы, прымушаюць адмаўляцца ад яе вывучэння..." Якая бессаромная хлусня! Хто адмаўляецца ў нас ад вывучэння рускай мовы? Хто і дзе яе выганяе са школы? Ну навошта гэта выдумляць? Дзеля чаго? Ды давайце хоць ураўняем іх — беларускую і рускую мовы — па становішчы! Па колькасці гадзін у школе.

Ах, шаноўныя, як жа ўсё-такі "лезе-вылазіць" з вас гэта непрыязнасць да мовы беларускага народа, як яна моцна сядзіць у вас і ў касцях і ў крыві! Як вы хапаецеся за ўсякую фразу закона, за якую можна ўхапіцца, за ўсякую больш чым сумніўную статыстыку! (Накшталт таго, што па дадзеных сацыялогіі толькі 6,5 працэнта бацькоў хочуць вучыць дзяцей на беларускай мове. Якой ці чыёй сацыялогіі? Вялікадзяржаўна-шавіністычнай? Тады дзіўна, чаму аж 6,5? Чаму не 1 або 0,5 працэнта? Відаць, толькі таму, каб хоць трохі было нейкай праўдападобнасці ў гэтай "сацыялогіі"!)

Ну і якую ж вы мэту ставіце? Самі сабе, спадзяюся, вы не хлусіце, ведаеце — якую? Тады павінны ведаць, што дабром такія "хітрыкі" не канчаюцца. І павінны ведаць, што, калі б нацыянальнае пытанне вырашалася ў былым СССР належным чынам — па-людску, з павагай да мовы і культуры кожнага народа, гэта значыць да душы народа, з забеспячэннем рэальнага раўнапраўя ў гэтай сферы, — не было б таго, што адбылося, бо, як кажа народная мудрасць: ад дабра дабра не шукаюць.

1993

Варвары? Дзікуны? Аглаеды?..

Прачытаў у друку: загінула, сышло ў нябыт каля 80 працэнтаў усіх малых рэчак Беларусі. Удумаемся: каля 80 працэнтаў! Гэта значыць, з кожных дзесяці рэчак і рэчачак васьмі не стала. З кожных дзесяці засталіся дзве. З усіх краін Еўропы (а можа, і цэлага свету) Бог выбраў сабе як самую вартую ягонай ласкі Беларусь і надзяліў яе шчодра, як ніякую іншую, самым каштоўным багаццем — рэчкамі і рэчачкамі. Чаму ён гэта зрабіў — не ведаю. Не хочацца думаць, што і Бог здольны памыляцца, але... Але мы, беларусы, аказаліся не вартымі Боскага дару. Мы пусцілі яго на глум і пагібель. За лёс нашай зямлі ўзяліся... Хто? Варвары? Дзікуны? Аглаеды? Ці так, ці сяк, ці гэтак — нелюдзі.

Яшчэ ў 1967 годзе, жахнуўшыся ад таго, што творыць на нашай зямлі гэтак званая меліярацыя, я напісаў верш "Раўняюць хлопцы рэчку". Вось яго пачатак:

Раўняюць хлопцы рэчку,
Майго маленства рэчку...

Уласна, рэчкі ўжо няма —
Мінулае сканала:
Нібы напятая струна,
Прасцерлася канава.

Віроў, дзе кружыць лісце,
Дзе нас малых калісьці
Русалкамі палохалі, —
Не стала тых віроў,
Дзе шчупакі пялёхалі —
Будзь здароў!
І тых парэчак чорных,
Што над вадой кусціліся
І птушак незлічоных,
Што ў гушчары гняздзіліся, —
Няма, няма нічога.

Раўнюсенькія берагі.
Раўнюсенькае дно.
Як быццам кут зусім другі —
Не той, што знаў даўно.

У канцы верша даю патлумачэнне, што прымусіла мяне ўзяцца за пяро. Глыбокае перакананне, што забойства жывой прыроды, тых жа рэчак і рэчачак — гэта забойства жывой чалавечай душы. Чалавек становіцца чалавекам у любоўным яднанні з прыродай.

Мне — душ шкада!
Хай будуць душы розныя,
Як нашы рэчкі родныя —
І з хвалямі бруістымі,
І з плёсамі празрыстымі,
З нябачнымі крыніцамі,
З вірамі-таямніцамі,
З вадзянікам, з русалкамі...
Стандартам іх не руш!
Хай будуць душы ўсякія,
Апроч нялюдскіх душ!

Ну, напісаў. Ну і што?

У Беларусі стратэгі і кіраўнікі меліярацыі беларускую паэзію не чытаюць.

1997

Апошняе слова ў навуцы...

Калісьці ўсе грамадзяне СССР, якіх гэта цікавіла, ведалі, што апошняе слова ў мовазнаўстве XX стагоддзя сказаў правадыр усіх працоўных свету і карыфей усіх навук І.В.Сталін. Яго брашурка "Марксизм и вопросы языкознания" для ўсіх, хто тады вучыўся ці вучыў іншых у ВНУ Савецкага Саюза, была без перабольшання настольнай кнігай. Але прайшлі дзесяцігоддзі — і аказалася, што апошняе слова ў мовазнаўстве XX стагоддзя, куды больш глыбокае і мудрае, сказаў не І.В.Сталін, а іншы правадыр і карыфей, іншы бліскучы знаўца праблем мовы, іншы непараўнаны аўтарытэт у галіне філалогіі. Вось цытата з геніяльнай навуковай працы гэтага іншага: "Люди, которые говорят на белорусском языке, не могут делать ничего, кроме как разговаривать на белорусском языке, потому что по-белорусски нельзя выразить что-то большое. Белорусский язык — бедный язык. В мире существует только два великих языка — русский и английский" (газета "Наша слова", 29 верасня 1999 г.).

Ну, гэтае апошняе слова ў нашым айчынным мовазнаўстве перакрыць ужо не ўдасца нікому — аніякаму і найвялікшаму карыфею.

1999

Чужое ўсё гэта нам, чужое!..

Эстэтычна і маральна малапісьменныя людзі з непамернымі амбіцыямі і прэтэнзіямі да грамадства, да дзяржавы патрабуюць і дзейнічаюць. Даказаць ім што-небудзь немагчыма, бо — гэта размова на розных узроўнях не толькі інтэлекту, культуры, а, самае галоўнае, — маралі і сумлення. Небяспека для грамадства ў тым, што такі амаральны ўзровень можа запанаваць, і будуць правіць баль бездухоўнасць, пошласць, цынізм.

Іх мэта (спецыяльны заказ?) — распаліць у чалавеку нізкія жывёльныя інстынкты, забіць у чалавеку і без таго слаба развіты духоўны пачатак, аскацініць яго, аскацініць як мага больш насельніцтва, ператварыць людзей у жывёльны статак. Для чаго? Статкам лягчэй кіраваць. Дастаткова мець палку ці бізун — і касмык сена, які можа называцца рублём ці доларам.

Усё, што мы робім насустрач рынычным адносінам, — ну хай сабе, ну добра — але чаму за кошт маралі? Чалавечнасці? Культуры? Эканамічны прагрэс, калі і ідзе, дык крокамі ліліпута, затое развал маралі ідзе крокамі Гулівера, сямімільнымі крокамі велікана, ідзе праз сродкі масавай інфармацыі, — асабліва і перш за ўсё. Гэта самы горшы від блудніцтва — блудніцтва духоўнага. Зараблянне грошай на самапрыніжэнні, на разбэшчванні, на самаагаленні. Гэта ўсё — тое, супроць чаго пратэстуе нармальны здаровы чалавек.

Гляджу на гэтых беспартыйных пашлякоў і цынікаў... Дзе яны нарадзіліся і выраслі? Няўжо на гэтай зямлі? Пад гэтым небам? Сярод гэтых пагоркаў, лясоў і пералескаў? Сярод гэтых лугоў і палеткаў? Тут, дзе само паветра насычана іонамі дабрыні, спагадлівасці, памяркоўнасці, сумленнасці, сціпласці?.. Адкуль жа гэтая драпежніцкая хцівасць, бесцырымоннасць, жорсткасць, гэта агідная бессаромнасць? Чужое ўсё гэта душы і розуму нашага народа, яго адвечнай маралі і светапогляду. Чужое!

Канец 1990-х

Хто кіраваў краінай

Балгарская прэса перадрукавала з "Комсомольской правды" некаторыя вельмі цікавыя звесткі пра асобу Л.І.Брэжнева. Напрыклад, такія.

У "бацькі застою" было 114 ордэнаў і медалёў, у тым ліку тры зоркі "Героя Балгарыі" (!!!). У апошнія месяцы жыцця ён расплакаўся, калі зразумеў, што яго хочуць узнагародзіць ордэнам, а не "Залатой Зоркай" Героя Савецкага Саюза, і ў Крамлі хуценька ўзнагароду памянялі. Былі ў яго і дзве маршальскія зоркі з дыяментамі. Кіцель Брэжнева з узнагародамі важыў шэсць кілаграмаў. Належаў яму і ордэн "Перамога" ("Победа"), які сёння каштаваў бы 16 мільёнаў долараў. На плацінавай зорцы, што ў аснове гэтага ордэна, 170 звышкаштоўных камянёў па 16 карат кожны. Гэтым ордэнам Л.І.Брэжнеў узнагародзіў сябе ў 1978 годзе, праз 33 гады пасля Перамогі (пасля Другой сусветнай вайны). У 1989 годзе, праз сем гадоў пасля смерці Брэжнева, М.С.Гарбачоў адабраў у нябожчыка гэты ордэн: у яго прэзідэнцкай пастанове значылася, што "ўзнагароджаны не адпавядае патрабаванням на гэтую ўзнагароду".

У Брэжнева нават былі дублікаты ўсіх зорак Героя. Пасля смерці знайшлі ў скрынцы 34 дублікаты — 13 зорак Героя Сацыялістычнай Працы і 21 зорку Героя Савецкага Саюза. Усе дублікаты былі з чыстага золата.

Ну, дык хто кіраваў вялікай краінай? Нармальны здаровы чалавек? А хто быў з ім побач? Хто слугаваў яго хворай дурноце?

2001, снежань

Усё той жа пракляты вырак

Германія, калі яна сёння сапраўды дэмакратычная, павінна помніць сваю віну перад Беларуссю яшчэ і за 1918 год. Ах, як жа яна тады падгадзіла нам! Тады нам, беларусам, архіважна было атрымаць ад Германіі маральную і палітычную падтрымку — прызнанне Беларускай Народнай Рэспублікі як незалежнай дзяржавы. Германія прызнала тады незалежнасць Украіны і незалежнасць Летувы, а незалежнасць БНР — не прызнала. Які гэта быў подлы ўдар! І тут нам гістарычнае нешанцаванне! І тут усё той жа пракляты вырак над намі! Хоць бальшавікі не паглядзелі б на пазіцыю Германіі і загрэблі б Беларусь усё роўна (як загрэблі Украіну) — і ўсё-такі, і ўсё-такі! Прызнай нашу незалежнасць Германія — можа, прызналі б і іншыя еўрапейскія дзяржавы. А як бы гэта астудзіла апетыт польскіх шавіністаў — у іх прэтэнзіі на "крэсы ўсходнія"! Але — і незалежна ад усяго гэтага. Ну чаму прызнала Украіну і Летуву — а БНР не прызнала?

Ах, Германія, Германія! Мы ж бы і сёння — іменна сёння! — успаміналі б тваё прызнанне з удзячнасцю.

2002

Дык думайма, браткі, думайма!..

У мове — духоўная энергія народа, якая акумулявалася ў ёй гістарычна, на працягу многіх стагоддзяў. І мы хочам далучыцца да гісторыі, да яе помнікаў, не выдаткоўваючы гэтай энергіі, не прыводзячы гэтую энергію ў рух? Без духоўна-душэўных затрат, якія ўтвараем, карыстаючыся родным словам? Не вызваляючы гэтую энергію? Скажам: за назвамі вуліц, паселішчаў — падзеі нацыянальнай гісторыі, у якіх акумулявалася энергія жыцця і быту, бо не было нічога выпадковага.

Ці можна выхоўваць павагу да помнікаў гісторыі і культуры — без павагі да мовы, да таго, што з'яўляецца вечнай і найбольш трывалай сувязной ніццю паміж эпохамі і часамі, паміж пакаленнямі? Адказ адназначны: немагчыма. Божа праміласць, як жа даказаць такім адукаваным і асвечаным таварышам, што ў мове — у мове! — жывая сувязь стагоддзяў, эпох, пакаленняў, перадавых ідэй, народнай памяці, болю — усё ў мове! Без мовы — без яе вечна жывога і жыватворнага пульсавання ў нас, у нашых пачуццях, у нашых душах — усё гэта застаецца, як правіла, на ўзбочча нашай самай глыбіннай чалавечай сутнасці, нібы чужое, хоць і цікавае, займальнае. Калі мы душою, мыслямі, пачуццямі не ў мове, не ў яе жывой стыхіі, — то наша сувязь з усім гэтым не жывая, не арганічная, не кроўная. І наш клопат пра ўсё гэта — як клопат не пра родных, а пра чужых дзяцей, якіх таксама, вядома, шкада, таксама любім, але нямногія падымаюцца да адчування іх як сваіх родных.

Вось чаму расправа з мовай — расправа з культурай — расправа з уласнымі імёнамі і назвамі — расправа з памяццю народа — расправа з гісторыяй — расправа з нацыянальнай свядомасцю — расправа з нацыяй як этнічнай асабовасцю, — гэта... крокі насустрач сваёй нацыянальнай смерці.

Дык думайма, браткі-беларусы, думайма!

1990

РАЗВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

Непараўнальная Элеанора

“Больш за ўсё на свеце яна ненавідзела нуду... А баялася галечы і забыцця”.

Так пісала ў сваёй аўтарскай калонцы ў адной з цэнтральных газет Элеанора Язерская аб сваёй любімай французскай пісьменніцы XX стагоддзя Францасузе Саган, якая памерла ва ўзросце 69 гадоў у поўнай галечы, забытая сваімі шматлікімі сябрамі...

Элеанора Язерская памерла ва ўзросце 67 гадоў. Таксама ў адзіноце, таксама доўгія гады перад гэтым існуючы на сціплую пенсію, адгарадзіўшыся цяжкай дэпрэсіяй ад сваякоў і сяброў.

Яна была выразнай персонай — і ў прафесіі, і ў жыцці, і ў нашым горадзе. Асабліва ў 1980-я, калі такіх заморскіх птушак — яркіх, трохі напышлівых жанчын, недаступных і прывабных адначасова, — у Мінску амаль не было. А Элеанора была ў росквіце! Я, прызнацца, доўгі час яе нават пабойвалася. Яна заўсёды выглядала гранддамай, адчувалася, што за сябе перад любым пастаіць. Але зрэшты даставалася ад навакольных і ёй: пляткарылі пра асабістае жыццё, пра экстравагантныя ўборы, пра памылкі, якія дапускала як вядучая ў кадры.

Цяпер я разумею, што яе памылкі ў параўнанні з сённяшняй моўнай неахайнасцю ў эфіры, проста мілыя агаворкі. А за асабістую экстравагантнасць так проста дзякуй — жыла б у Англіі, праславілася як Вів’ен Вествуд. А наш правінцыйны Мінск, вядома, капелюшоў, пёраў, бранзалетаў і бантаў ёй не даравaў...

Аднойчы я прыйшла да яе на інтэрв’ю. І была ўражана абаяннем, метафарычнасцю, вобразнасцю прамовы, эрудзіраванасцю. Элеанора Язерская скончыла кансерваторыю, была дыпламаваным музыказнаўцам. А яшчэ яна была прыроджанай свецкай ільвіцай, жанчынай на подыуме. Жартавала: “Як вядома, сапраўдная жанчына з нічога павінна ўмець зрабіць тры рэчы: салат, капялюшык і трагедыю”. І наогул распавядала пра сябе так лёгка і займальна, што я была здзіўлена: колькі вялікіх знаёмстваў, колькі вядомых апекуноў!.. Уласна, яе кватэра ў Мінску даўно ператварылася ў зорную гасцёўню, яна любіла і ўмела збіраць каля сябе цікавых людзей.

Але прыйшоў час, і з Беларускага тэлебачання знік “Салон Элеаноры Язерскай” — праграма пра музыку і музыкантаў, якая шмат гадоў мела нядрэнны рэйтынг. Для Язерскай гэта быў шок. Яна стала змагацца за сваю справу, назвала знішчэнне праграмы “сапраўднай расправай” над сабой, сабрала прэсканферэнцыю. У мяне захаваўся запіс яе выступлення. Яна тады сказала, як заўсёды, у сваім стылі:

— Ад мужчын я заўсёды сыходжу на 15 хвілін раней, чым яны паспеюць падумаць пра гэта, але што тычыцца майго каханага тэлебачання, то я хачу працаваць, магу працаваць і, думаю, павінна працаваць. Я добра ведаю прадмет, якім займаюся, — музыку, мастацтва. Я нарэшце выразна вымаўляю ўсе літары рускага і беларускага алфавітаў, і голас у мяне не брыдкі, што для вядучай шмат значыць. Я шчырая ў кадры, умею адстаяць свой пункт гледжання і, мабыць, па-чалавечы абаяльная — гледачы даўно ведаюць, а многія любяць мяне. І імя, заўважце, я зрабіла сабе не на забаўляльных праграмах, а на асветных перадачах пра беларускую музыку, распавядаючы аб сімфоніях Пукста і Чуркіна. Але, напэўна, я нядрэнна пра гэта расказвала, раз дамаглася папулярнасці!

Але праграму вярнуць яна не змагла, бітву не выйграла. Больш за тое, неўзабаве тагачасны старшыня Белтэлерадыёкампаніі **Ягор Рыбакоў**, які трохі пазней трапіў за краты за хабар у асабліва буйным памеры, звольніў журналістку з працы. На пенсію. Мабыць, першую сапраўдную дэпрэсію Элеанора Аркадзьеўна перажыла менавіта тады, застаўшыся на пачатку 2000-х без свайго любімага тэлебачання. Ды і без прыстойнага заробку. І заступнікі не дапамаглі, ды і хто яны былі? Заслужаныя людзі культуры і мастацтва... Прыйшлося прадаваць кватэру, купляць меншую.

Зрэшты, тэлежурналістка не адышла ад свецкага жыцця горада ў поўнае забыццё, не той гэта быў чалавек. Пісала ў газеты, потым стала працаваць на СТБ — вяла зноў-такі аўтарскую праграму “Вялікія жанчыны XX стагоддзя”, удзельнічала ў музычных праектах, нават здымалася ў эпізодах у кіно.

Элеанора Аркадзьеўна Язерская была прафесіяналам і вельмі абаяльным чалавекам. У апошнім інтэрв’ю некалькі гадоў таму казала, што лічыць сябе шчаслівай жанчынай. Але дэпрэсія аказалася мацнейшай. Развітацца з вядомай жанчынай і тэлежурналісткай на грамадзянскую паніхіду, якая праходзіла ў фае Белтэлерадыёкампаніі, прыйшлі многія вядомыя людзі Мінска: мастакі, музыканты, “малады выдатны сябар”, як называла яго сама Элеанора, спявак **Віталік Жукофф**. Чуткі пра тое, што цела нябожчыцы два тыдні праляжала ў зачыненай кватэры, не пацвердзіліся, з хворай на сувязі ўвесь час былі сваякі, літаральна за дзень да смерці ёй прынеслі яе любімыя пірожныя. Яны, праўда, так і засталіся некранутымі на камодзе ля люстэрка ў пярэднім пакоі. У апошнія месяцы Элеанора не хацела ні з кім мець зносіны, перастала есці, схуднела на 40 кілаграмаў.

У нядзелю непараўнальную Элеанору Язерскую Беларускага тэлебачэння пахавалі на Усходніх могілках.

Алена МАЛОЧКА.

ШАЙ-БУ!

Здымаем капялюш...

Як бы ні завяршылі беларускія хакеісты чэмпіянат свету, які працягваецца ў Мінску, але ўжо сёння можна канстатаваць прыемны факт — беларускі трэнерскі штаб здолеў стварыць калектыў.

Эмоцыі, якія перажылі балельшчыкі ў мінулыя выхадныя падчас сустрэчы беларусаў з нямецкай камандай, проста неперадавальныя.

Уявіце сабе: ужо на 12-й хвіліне першага перыяду наша каманда прайгравала — 0:2! І ў гэты момант трэба аддаць належнае аматарам хакея і трэнерам беларускай зборнай. Першыя пачалі з новай сілай падтрымліваць хакеістаў, а апошнія ўзялі тайм-аўт, каб супакоіць ігракоў, сказаць ім, што нічога не згублена, а ўсё толькі пачынаецца...

І пачалося — ды як пачалося! Беларусы паказалі характар, шайбы адна за другой са свістам пачалі “класціся” ў вароты нямецкага галкіпера, зборная Беларусі злавіла кураж, і ў той дзень яе ўжо было не спыніць! У выніку — 5:2 на карысць беларусаў.

Здавалася, што пасля матча балельшчыкі святочнай дэманстрацыяй пройдуць па вуліцах Мінска, каб яшчэ раз выказаць сваю радасць, але свае карэктывы ўнесла надвор’е. Дождж, які лінуў на галовы балельшчыкаў акурат пасля гульні, прымусіў разбегчыся задаволеных матчам фанатаў...

Трэба сказаць, што тры зборныя ўжо забяспечылі сабе “месца пад сонцам” у плэй-оф першынства. Гэта зборныя Швецыі, Канады і Расіі. Пры гэтым расіяне — адзіная каманда на чэмпіянаце, якая наогул не прайграла ніводнай гульні.

Становішча каманд на 18 мая (без уліку ўчарашніх матчаў):

Група “А”

1. Канада — 15 ачкоў (6 матчаў); 2. Швецыя — 15 (6); 3. Чэхія — 10 (6); 4. Францыя — 7 (5); 5. Нарвегія — 7 (6); 6. Славакія — 7 (6); 7. Данія — 5 (5); 8. Італія — 3 (6).

Группа “В”

1. Расія — 18 ачкоў (6); 2. ЗША — 11 (6); 3. **Беларусь** — 9 (5); 4. Латвія — 9 (5); 5. Фінляндыя — 8 (6); 6. Швейцарыя — 7 (6); 7. Германія — 5 (6); 8. Казахстан — 2 (6).

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

P.S. *Учора ўвечары зборная Беларусі правяла матч з камандай Латвіі. Гульня закончылася каля 23.00, таму графік выхаду газеты не дазволіў расказаць чытачам пра вынік сустрэчы. Сачыце за падзеямі на нашым сайце.*

ФОТАФАКТ

Каларытныя хакейныя балельшчыкі

Хакейнае першынство — гэта не толькі супрацьстаянне каманд, але і парад балельшчыкаў.

Аматары хакея з розных краін быццам спаборнічаюць у яркасці, незвычайнасці, каларыце.

Мінчане ўжо прызвычаіліся да іх і з задавальненнем фатаграфуюцца на памяць. Даўно ўжо беларуская сталіца не была такой стракатай...

Аляксандр НІКАНОРАЎ.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Хакей

Ва ўсіх трывог
З турботамі пабольшала.
І пільнасць нам патрэбна, як нідзе!
Ты чуеш, век, хакейнае пабоішча
На лёдавай арэне
Аж гудзе.

Абвал грымот
Суцэльнаю лавінаю,
Як быццам з-пад скляпення і з бакоў.
Апладысменты кожнаю хвілінаю,
Мацней за грукат горных
Леднікоў.

Над Тэмзаю
Замоўклі пэры з лордамі.
І свет глядзіць, здаецца, не дыхне,
Як шайбай спрыт на лёдзе завалодае
Ды па варотах прутка
Шыбане!

Мы за спартсменаў
Нашых надта гордыя.
Хаця ў жыцці — то крызіс, то застой,
Усё адно за першынство з рэкордамі
Даюць Героя з Зоркай
Залатой!

Ды як хвалу б
Ні пелі хорам кенары,
Чым болей, тым, вядома, саладзей, —
Ах, Божа, хіба ад гульні хакейнай
Залежыць сёння дабрабыт
Людзей?

Табе хакей
На д’ябла быў надоечы,
А сёння рвешся ў гул яго з цішы.
А можа, гэта з мітуснёй відовішча
Багацце, што з багаццяў,
Для душы?

На гэтым свеце
Верх бярэ па-звыкламу
То люты звер, то зноўку чалавек.
Якое ўсё ж каленца хітра выкіне
Чарговага тысячагоддзя
Век?

Ідуць, гудуць
Хакейныя баталіі,
Трашчыць і стогне пад канькамі лёд,
І гул ляціць, грыміць аж да Брытаніі,
На шайбы прадракаючы
Ўмалот.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Колькі грошай замежныя аматары хакея пакідаюць у Беларусі?

Паводле падлікаў тэлеканала АНТ, падчас чэмпіянату свету дзяржава плануе зарабіць на замежных турыстах каля 70 мільёнаў еўра — маўляў, кожны госць патраціць у Беларусі як мінімум 3500 еўра. “Народная Воля” звярнулася да некаторых балельшчыкаў з пытаннем: “Колькі грошай вы збіраецеся пакінуць у Беларусі?”

Ёзэф КРАУС (Германія):

— Зарэзерыраваў усе гульні з удзелам нямецкай каманды. За турыстычны пакет паездкі з 9 па 21 мая на хакей у Мінск заплаціў 1300 еўра. Сюды ўваходзяць білеты, авіяпералёт і пражыванне ў гатэлі “Спадарожнік”. А ў дзень у мяне выдаткі складаюць прыкладна 30—50 еўра. Праўда, у розныя дні па-рознаму. Бывае, што я зусім не п’ю, а здараецца, і вельмі шмат... Але ў выніку, думаю, што за 13 дзён пакіну 400—650 еўра.

Дарэчы, я шмат бываў на розных чэмпіянатах свету ў розных краінах, і ў Мінску мне падабаецца больш за ўсё. У вас вельмі прыгожыя дзяўчаты...

Марка МАЕР (Швейцарыя):

— Я прыехаў з Цюрыха 9 мая — на першую гульню швейцарцаў са зборнай Расіі. Дадому накіроўваюся 21 мая. Мне турыстычная пуцёўка абышлася прыкладна ў 1700 еўра, праўда, гатэль “Вікторыя” — ён не з танных. На суткі мяняю недзе 80 еўра, і, паверце, нічога не застаецца.

Мне ў Мінску больш за ўсё арэна спадабалася — у нас такіх няма. А не спадабаліся вельмі гучная музыка наўкол і дыскатэкі. Я разумею, што многія гуляюць да раніцы, але ж не ўсе...

Ханс РУРУП (Данія):

— Мы завіталі кампаніяй у Мінск з трохдзённым візітам — з 16 па 18 мая. Вырашылі падтрымаць нашу каманду ў матчы Чэхія—Данія. Пасяліліся ў гасцініцу “Планета”, за пражыванне заплацілі 1 мільён 800 тысяч рублёў на ўсіх. А ў першы дзень я адразу ж патраціў у Мінску 150 еўра. Быў невялікі шопінг, піва, дзяўчаты...

Ян МАЙЛІНГ (Славакія):

— Прыехаў у Мінск з сябрамі 13 мая. Будзем тут знаходзіцца, пакуль наша каманда не “вылеціць” з турніра. Тым больш што за жыллё плаціць не трэба — жывём на кватэры ў нашага славацкага сябра, які працуе ў беларускай сталіцы. Але за ўсё астатняе даводзіцца плаціць, таму ў дзень кожны стараецца ўкладвацца ў 100-доларавы бюджэт. Асноўная частка выдаткаў — піва, гарэлка, дзяўчаты... Жарт!

Юрый СІМАНАЎ (Расія):

— Вырашылі правесці ў беларускай сталіцы тры дні, пасяліліся ў гасцініцы “40 гадоў Перамозе”. Шчыра кажучы, чакалі, што пражыванне будзе больш таннае, бо 100 долараў з чалавека ў суткі — не так і мала. А наогул, думаю, што сям’і на тры дні 20 тысяч расійскіх рублёў (каля 600 долараў) хопіць.

Айвар (Латвія):

— Мы з сябрам знялі прыватную трохпакаёвую кватэру. За дзесяць дзён пражывання заплацілі тысячу долараў. Па знаёмстве шукалі жыллё — праз беларускіх сваякоў. Плюс разлічваю патраціць 800—900 еўра на іншыя выдаткі. Хаця гледзячы як гуляць.

Хачу дадаць, што кошты ў Мінску амаль такія ж, як і ў Латвіі, — нешта танней, нешта даражэй. А ўвогуле балельшчыкі, калі прыязджаюць на такія мерапрыемствы, грошы не лічаць. Яны вязуць іх з сабой, каб патраціць...

Алесь СІВЫ.

ДАРЭЧЫ

Дэпартамент па турызме Літвы паведамляе, што кожны беларускі турыст пакідае ў Літве каля 450 еўра.

А ў Польшчы беларусы патрацілі ў мінулым годзе прыкладна мільярд долараў. Гэтая сума складае больш за 30 працэнтаў польскага экспарту ў Беларусь.

МНЕНИЕ

«Мертвый сезон» белорусского любительского бокса

Ни для кого не секрет, что один из наиболее зрелищных и мужественных видов спорта — любительский бокс — переживает в Беларуси не лучшие времена. Провалы на Олимпиадах в Пекине и Лондоне, а также на чемпионате мира в Казахстане — прямое тому подтверждение.

Почему я об этом пишу? Да потому, что провалы красноречиво говорят о том, что проблемы в этом виде спорта по-прежнему требуют срочных, но хорошо обдуманных решений. Ведь Олимпиада в Бразилии не за горами.

Мне кажется, что в нашем боксе сейчас царит какой-то “мертвый сезон”. Все, кто виноват в плачевном состоянии отечественного бокса, отмалчиваются. Ничего не слышно о жизни и деятельности федерации бокса, тренеров сборной... Молчит и председатель федерации Дмитрий Михайлов, и очередной новый главный тренер национальной команды...

А ведь от их слов и дел зависит очень многое. Важно знать, как устраняются недостатки и решаются проблемы, которые вышли наружу. Без их решения нет движения вперед. Об этом нужно говорить открыто, а не отмалчиваться.

Да, конечно, есть объективные причины неудач. Слабая материально-техническая база, недостаточные научно-методическое обеспечение и финансовая поддержка.

Тревожит прежде всего отсутствие научно обоснованной концепции развития бокса в стране. Насколько мне известно, группа специалистов во главе с Э.Дубовским несколько лет назад обратилась с письмом о неудовлетворительном состоянии нашего бокса и внесла предложения, но лед так и не тронулся. Наши спортивные чиновники, видимо, не хотят понять — пока не будет единой концепции, положение вряд ли изменится в лучшую сторону. Кстати, такая научная концепция уже есть у наших ближайших соседей — России и Украины. Не поэтому ли у них на Олимпиадах такие результаты, о которых мы можем только мечтать?

Не могу умолчать о том, что на результатах наших боксеров сказывается и слабая квалификация тренеров. Значит, нужно постоянно учиться у тех, кто идет впереди. Может быть, пришло время смелее приглашать и иностранных специалистов. Но ключевой кадровый вопрос, как мне видится, это вопрос о главкоме сборной страны. На мой взгляд, у нас есть авторитетнейшие люди в боксе — В.Баранов, Э.Дубовский и, конечно, В.Яновский, который сейчас работает в России. Нашего земляка, олимпийского чемпиона, нужно пригласить вернуться на родину, создать ему все необходимые условия. Уверен, результаты наших спортсменов не заставят себя долго ждать.

Впрочем, сами боксеры тоже должны осознавать, что бокс для них — главное. Только тогда они будут побеждать, а не уходить с ринга побежденными.

Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран спорта, заслуженный тренер Беларуси.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл.рэкламнага аддзела: (017) 3286609, 3286906
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

ISSN 2071-9647
9 772071 964000 14038

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 19.05.2014 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26500 экз. Заказ №1913.